Дадатак 1
да загада галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага абласнога выканаўчага камітэта
ад ___02.02.____ 2022 г. № 23__

**Палажэнне**
аб правядзенні абласнога агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку работы па пазастацыянарнаму абслугоўванню сельскага насельніцтва “Маршрут – далёкая вёска”

**Мэты абласнога агляду-конкурсу.**

Абласны агляд-конкурс на лепшую пастаноўку работы па пазастацыянарнаму абслугоўванню сельскага насельніцтва “Маршрут – далёкая вёска”, прымеркаваны да Года гістарычнай памяці (далей – абласны агляд-конкурс), праводзіцца ў мэтах:

- удасканалення культурнага абслугоўвання жыхароў маланаселеных і аддаленых вёсак аддзеламі (сектарамі) па абслугоўванню сельскага насельніцтва культурна-дасугавымі ўстановамі раёна;
- павышэння якасці і эфектыўнасці культурных паслуг, пошука цікавых форм работы ў арганізацыі вольнага часу насельніцтва;
- развіцця форм супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння аддзелаў (сектароў) з іншымі ўстановамі і арганізацыямі па абслугоўванню сельскага насельніцтва.

**Кіраўніцтва абласным аглядам-конкурсам.**

Для падрыхтоўкі і правядзення абласнога агляду-конкурсу ствараецца абласны аргкамітэт, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гомельскага аблвыканкама, установы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” і аддзелаў ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лоеўскага і Рагачоўскага райвыканкамаў.

У перыяд падрыхтоўкі агляду-конкурсу аргкамітэт далучае сродкі масавай інфармацыі да асвятлення яго ходу, дапамагае ў яго правядзенні, ажыццяўляе непасрэднае кіраўніцтва аглядам-конкурсам у тэрмін правядзення мерапрыемства.

**Умовы і парадак правядзення.**

У абласным аглядзе-конкурсе прымаюць удзел аддзелы (сектары) і культарганізатары па пазастацыянарнаму абслугоўванню сельскага насельніцтва, сельскія ўстановы культуры клубнага тыпу, якія абслугоўваюць маланаселеныя і аддаленыя вёскі.

Абласны агляд-конкурс праводзіцца ў два этапы:

**І этап** – аддзелы (сектары) і культарганізатары юрыдычных клубных устаноў **да 15 ліпеня прадстаўляюць** заяўку (форма заяўкі дадаецца), інфармацыйна-аналітычную даведку і ілюстратыўныя матэрыялы аб дзейнасці аддзелаў (сектароў) за 2020-2021гг. і першую палову 2022 года (форма дадаецца) на электронны адрас ocnt6@mail.gomel.by, установа “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”, аддзел аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці.

На афіцыйным сайце ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” да 20 ліпеня будзе размешчаны спіс удзельнікаў абласнога агляду-конкурсу.

**ІІ этап** – прагляд конкурсных праграм аддзелаў (сектароў) і культарганізатараў:

6 жніўня, Рагачоўскі раён

1. Кармянскі раён
2. Буда-Кашалёўскі раён
3. Веткаўскі раён
4. Добрушскі раён
5. Жлобінскі раён
6. Рэчыцкі раён
7. Светлагорскі раён
8. Чачэрскі раён

7 жніўня, Лоеўскі раён

1. Жыткавіцкі раён
2. Брагінскі раён
3. Акцябрскі раён
4. Ельскі раён
5. Калінкавіцкі раён
6. Хойніцкі раён
7. Петрыкаўскі раён
8. Лельчыцкі раён

На конкурс прадстаўляюцца розныя формы работы на выбар: тэатралізаванае прадстаўленне, літаратурна-музычная кампазіцыя, інфармацыйна-творчая, канцэртна-гульнёвая ці забаўляльная праграмы.

Працягласць конкурснай праграмы да 20 хвілін.

**Падвядзенне вынікаў абласнога конкурсу і ўзнагароджванне.**

Крытэрыямі ў вызначэнні пераможцаў з’яўляюцца:

- супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі і аб’яднаннямі;
- канцэртнае абслугоўванне жыхароў маланаселеных вёсак;
- мастацкі ўзровень тэматычнай праграмы;
- арыгінальнасць сюжэту, рэжысёрскай задумы;
- узаемадзеянне з аўдыторыяй;
- мастацкае афармленне (касцюмы, дэкарацыі, рэквізіт).

Журы на падставе прадстаўленых матэрыялаў і прагледжаных конкурсных тэматычных праграм падводзіць вынікі агляду-конкурсу і вызначае лаўрэата з уручэннем Гран-пры, дыплома і каштоўнага падарунка на суму ў памеры да 8 базавых велічынь; дыпламантаў I, II, III ступеняў з уручэннем дыплома і каштоўнага падарунка: I ступені – на суму ў памеры да 7 базавых велічынь; II ступені – на суму ў памеры да 6 базавых велічынь; III ступені – на суму ў памеры да 5 базавых велічынь.

Аргкамітэт абласнога агляду-конкурсу прадугледжвае ўзнагароджванне дыпломамі і каштоўнымі падарункамі на суму ў памеры да 2 базавых велічынь у 3 намінацыях:

- самы крэатыўны загадчык аддзела (сектара);
- за лепшае супрацоўніцтва з іншымі арганізацыямі і ўстановамі;
- а лепшае асвятленне дзейнасці аддзела (сектара) у сродках масавай інфармацыі.

Пры неабходнасці журы астаўляе за сабой права прысудзіць не ўсе дыпломы, змяніць намінацыі альбо ўвесці новыя. У выпадку непрысуджэння, раздзялення месцаў паміж удзельнікамі дапускаецца раздзяленне каштоўных падарункаў у межах прадугледжаных сродкаў.

Рашэнне журы канчатковае і перагляду не падлягае.

Усе астатнія ўдзельнікі абласнога агляду-конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел.

Па выніках абласнога конкурсу будзе выданы буклет.

**Фінансаванне.**

Фінансавыя выдаткі па арганізацыі і правядзенні абласнога агляду-конкурсу ажыццяўляюцца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных установе “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці” на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў у рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы “Культура Беларусі” на 2021-2025 гг.

**Камандзіровачныя и транспартныя выдаткі.**

Транспартныя і камандзіровачныя выдаткі ўдзельнікаў абласнога агляду-конкурсу ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючага боку.

**Кантакты.**

Кантактны нумар (0232) 337302, +37529 1818945, Хахракова Таццяна Уладзіміраўна, вядучы метадыст па культурна-дасугавай дзейнасці ўстановы “Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці”.